**С. Б.** Віцебск – і Салярцінскі / С. Б. (Бересцень) // Літаратура і мастацтва. – 2003. – 25 ліп. (№ 30). – С. 2.



**Віцебск – і Салярцінскі**

Знаўца музыкі, гісторык літаратуры, філосаф і паліглот, лектар і пубпіцыст... Гэта ён, Іван Салярцінсі, Чалавек эпохі віцебскага рэнесансу 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Больш за "Славянскі базар" жыве ў Віцебску Міжнародны фестываль камернай музыкі яго імя, заснаваны па ініцыятыве мастацкага кіраўніка беларускага ансамбля салістаў "Класік-Авангард" Уладзіміра Байдава, дарэчы, віцябляніна. І падчас фестывалю абавязкова наладжваюцца навукова-папулярныя чытанні, удзельнікі якіх дадаюць усё новыя штрыхі да дзівоснага феномена – прыгожага загадкавага горада на Дзвіне, ауру якога стваралі Бахцін, Шагал і Малевіч, Малько і Салярцінскі…

Сусветна вядомы дырыжор Мікалай Малько зрабіў вялікі ўплыў на фарміраванне музычнага светапогляду дапытлівага юнага віцябляніна. Крыху пазней, пераехаўшы ў Пецярбург, Іван Салярцінскі пазнаёміцца з маладым Дзмітрыем Шастаковічам і да канца свайго нядоўгага жыцця застанецца лепшым сябрам і творчым дарадцам геніяльнага кампазітара.

Некалькі гадоў таму імя І. Салярцінскага было нададзена Віцебскаму музычнаму вучылішчу, у зале якога, дарэчы, праходзяць і многія канцэрты Міжнароднага фестывалю камернай музыкі. Падзея тая шчыра ўзрушыла Дзмітрыя Салярцінскага (сына Івана Іванавіча) – вядомага дзеяча сучаснага філарманічнага жыцця Санкт-Пецярбурга і рупнага ўдзельніка віцебскіх фэстаў. А падчас сёлетняга "Славянскага базара" Салярцінскі-малодшы перажыў новае прыемнае ўзрушэнне: адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка яго знакамітаму бацьку паблізу музычнага вучылішча, якое, вядома, носіць яго імя. Аўтар помніка – віцебскі скульптар В. Магучы. Падзея гэтая амаль супала з юбілейнай нагодай: у снежні 2002-га адзначалася стагоддзе з дня нараджэння І. Салярцінскага, што надавала асабліва ўрачысты характар чарговаму фестывалю, заснаванаму ў гонар вялікага земляка...

**С.Б.**

**Фота Г. ЖЫНКОВА**